Мікола ЧАРНЯЎСКІ

НАШТО БАБЕ АГАРОД?

САТЫРА І ГУМАР

Мастацкае афармленне А. ГУРСКАГА.

БІБЛІЯТЭКА «ВОЖЫКА»

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КПБ
МІНСК — 1989

ШТО СА МНОЙ?

Хоць за праўдаю знябытай
Разглядзець няпраўду мог, —
Не заўважыў,
Як аблытаў
І душу, і думкі мох.

Не ўпіраўся, не пярэчыў:
Што ні крок —
Глыбей у лес.
У палон
Хлусні і рэчаў
Сам, як сёння бачу,
Лез!

З году ў год пад маршы-песні
Тупаў бойка, ім у лад.
Ногі — ўперад
Шпарка неслі,
Галаву ж —
Вяло назад.

Можа, выдумкай пустою
Гэта раптам усплыло?
Можа, гэтага застою,
Як маны ўсёй,
Не было?

Думаў я: мой плён нятленны,
Забаўляўся гаманой.
А настала прасвятленне —
Спахапіўся:
Што са мной?

Час застойны —
Быў я здольны
Ліць ялей ды ў ладкі біць.
Час застойны —
Час застольны, —
Галава й цяпер баліць!

ДАЎГІ

Меўся ўзяць ён абцугі —
Вырваць культу цвік іржавы.
Стаў таварыш Дарагі
Стырнавым усёй дзяржавы.

І пацёк руччом ялей.
Заспявалі: «Бацька родны...»
Абцугі схаваў далей
Ён тады: «А цвік — прыгодны...»


Пахвальба, нібы дамкрат.
Хоць памалу.
Ды ўздымала:
«Праўдалюб і дэмакрат.
Кіраўнік, якіх замала!»

Пышнай славы пірагі
Выпякалі словаблуды:
«Дарагі...» ды «Дарагі...»
І ўзахлёб заўжды.
І — ўсюды.

Балбатні хлуслівай
хлуд
Біў па думках.
Лез у душы.
Словаблуд і лізаблюд
Селі ў покуць, як чынушы.

І ў застольным тлуме тым
Не заўважылі ў гаворках:
Дарагі стаў ... з а л а т ы м —
З галавы да ног
У зорках!

Што ні дзень, рамень тужэў
Не прымаў прамоў крылатых...
Дарагі ўсё даражэў.



Ды не ў сэрцах,
А ў дакладах.

Рос «прэстыж» — раслі даўгі
Ці ж да іх —
Да славы падкім?
...Спіць таварыш Дарагі.
А даўгі вяртаць
Нашчадкам.

СЕНЬКАВА ШАПКА


Ён выступаў з трыбун падчас,
Хадзіў на задніх лапках.
Яго заўважылі: «Саўгас —
Якраз па Сеньку шапка...»

Заняў ён гулкі кабінет —
Метал з'явіўся ў нотках.
Яшчэ ж у Сенькі неўпрыкмет
Змянілася паходка.

Перад начальствам — як раней,
Ступаў без лішніх рухаў.
Перад астатнімі ж — часцей,
Нібы па бруку,
Грукаў.

Яны паўшэптам, праз парог,
Пыталі ў сакратаркі:
— Ён сёння ўстаў з абедзвюх ног,
Нас не турне ў тры каркі?

І кіраваў, і слыў бажком,
Не чуў, каб нехта джаліў,



Хоць слаў камісіі абком,
З райкома наязджалі...

Хто патураў яму —
пайшлі,
І Сенька здаў сявеньку:
За імі ўслед
яго знялі —
Далі па шапцы Сеньку.



2 Зак. 204

ШПУНТ



Хоць мог на пуд.
Рабіў — на фунт.
Хоць перуны грымелі, —
Ды ўсё-ткі заставаўся Шпунт
Пры крэсле.
Пры партфелі.

Лятаў туды.
Лятаў назад.
Кракта́ў: «Такая доля...»
Аж пяцьдзесят
Змяніў пасад.
А можа, нават болей!

Лятаў.
Бо з грукатам глухім
Шпурляла «зверху» слова:
Заткнуць, бывала.
Дзірку ім,
Ды ведаў Шпунт
Часова.

Ён вылятаў,
Бо кіраваў,
Куды б ні ткнулі.
Слаба:
Была і ў Шпунта галава,
Ды не таго маштабу.

Хоць не адзін гузак набіў,
Застаўся ў крэсле ўтульным.
Бо гэты Шпунт
Не простым быў.
Ён быў —
на-мен-кла-тур-ным!



КРЫВАЯ...

МАТЭМАТЫКА


Колькі будзе
тры на пяць?
Цяжка памыліцца.
Я ж даўмеўся акругляць:
Не пятнаццаць —
Трыццаць.

Я сумленне не цугляў:
Мне было не сорам,
Калі часам акругляў
І вышэй —
На сорак!

Не заплюшчваў я вачэй
На такое «ўменне»,
Бо дзяліць было лягчэй...
У свае кішэні.

Ведаў добра, што раблю,
Быў я «спец»,
Не лапаць.
Ведаў: болей акруглю —
Болей можна ўхапаць!

Хоць чакаў,
Не збыўся цуд:
Па маім парадку
Акругліў мне тэрмін суд —
Даў усю дзесятку!




НУКАЙЛА

Рукамі трос,
Панукваў, рос —
Дабраўся да пасады.
Заўжды трымаў па ветры нос:
«Ці сівер?
Ці пасаты?»

Каб чуўся рух,
Каб чуўся зрух,
Каб поспехі буйнелі,
Не выпускаў ён лейцаў з рук —
Напятымі
Звінелі!

З вазка заўзята кіраваў,
З вазка відней, вядома.
За лейцы тузаў,
Не даваў
І рот раскрыць нікому!

Нос лез і лез усё ўгару,
А з ім — і сам начальнік:



Для падначаленых —
Пярун,
А для вярхоў —
Маўчальнік.

Ён падганяў,
Ён горла драў,
Нукайла знакаміты,
Аднак разгон марудна браў
Вазок —
Стары, разбіты.


Воз лескатаў, зрабіўшы крэн
Да ўзбочыны-адхону...
О, рэзкі вецер перамен, —
Кульнуў яго
З разгону!


Нукайла ў скрусе — не вярнуць
Ні лейцаў,
Ні пасады...
Чакае ўсё ж: «Мо падбяруць,
Мо зноў падзьмуць пасаты?..»

ПРЫЛАЎКІ... СА ШКЛА

Ля крамы
Пачуў я размову бабуль.
Адна ў аднае пытаюцца:
— Чаму гэта ўсе прадаўшчыцы
Адсюль —
І дня не міне —
Разбягаюцца?

— А ты прыжылася б,
А ты б не ўцякла?
Не бачыла хіба,
Не знаеш? —
Ды тут парабілі прылаўкі
Са шкла, —
Як,
Што
Пад такімі схаваеш?





НЕПРАЦОУНЫЯ ДАХОДЫ

Час, багаты на прыгоды,
Што яшчэ нам прынясе?
Непрацоўныя даходы,
Непрацоўныя даходы...
Як пачую —
Аж трасе.

Меў я выручку заўсёды,
Хоць, здавалася б, не краў.
Непрацоўныя даходы.
Непрацоўныя даходы...
Сам даваў
І сам жа браў.

Спазнаваў я з асалодай,
Што за ён, рубель даўгі.
Непрацоўныя даходы,
Непрацоўныя даходы —
Вельмі сумныя даўгі.

Ад сям'і сагналі ў далеч
Кнігу шэрых дзён гартаць:
І рублямі,
І гадамі
Я павінен іх вяртаць.



ПЕСТУНЫ

Братамі мне — усе
жывыя:
Люблю ласёў, люблю
баброў.
Але здаецца, што
завыю
Ад гарадскіх
сабакароў...


Г. Бураўкін.

Здаецца, ім ні да абедаў,
Ні да шыцця,
Ні да пруткоў:
Сабак прагульваюць кабеты,
Нібы са стайні жарабкоў.

Вядуць,
За кожным сочаць рухам,
Каб раптам дог
Ці той бульдог
За пінчэрам —
Бясхвостым зухам —
Да сучкі вулічнай
Не ўлёг!

Як ірвануць, то дай ім рады!
Бо кожны ў сіле,
Не слабак...
І ўсе ў пад'ездзе сваркі-звады
Не з-за дзяцей —
З-за іх, сабак.


Пачнуць кляцьбу як біркі вешаць —
Хоць не паказвайся ў двары:
Сабакі, мусіць,
Меней брэшуць,
Чым людзі — іх гаспадары!



Ці ж утрымаешся з гарачкі,
Калі баліць,
Калі шчыміць? —
Сусед аж мрэ, каб хвост сабачку
Ці лапу ў ліфце
Прышчаміць!

...Пад перабрэх згаданы плёткі,
Навінкі мод,
Варункі сноў:
Сабак прагульваюць малодкі —
Чацвераногіх пестуноў.

Шнуруюць бойка, без апаскі
Бульдогі,
Выжлы,
Ганчакі.
...А дзеці дзесь
шукаюць ласкі
Ля цёплай бабчынай шчакі.



МОДНІЦА

Бабуля Наста,
Дзед Тарас
Цвітуць, хоць пазайздросць ім:
— Унучка, гляньце-тка, да нас
Наведалася ў госці!
Бабуля ўнучку ў дом вядзе,
Трымаючы за ручку.
Блінкоў пад'еўшы,
Неўспадзеў
Бабулі кажа ўнучка:
— Ты, бабка, крыку не рабі,
Бо я даўно з пялёнак,
Ты завушнічкі мне купі
І залаты пярсцёнак.
Ты ж грошай, думаю, збярэш?
Стаць моднай —
Ох як рупіць!
Хутчэй купі,
Бо, як памрэш, —
Хто ж мне тады іх купіць?

Бабуля Наста,
Дзед Тарас
Няўцямна паглядаюць:
Што ёй сказаць на першы раз? —
Не ведаюць,
Не знаюць.

Унучку дзед у сад вядзе,
Трымаючы за ручку.
Сарваўшы яблык,
Неўспадзеў
Дзядулю кажа ўнучка:
— Ты ж, дзедка, добры, не скупы?
Каб я была, дзед, рада, —
Мне залаты кулон купі,
Яшчэ купі памаду.
Ты ж грошай, думаю, збярэш?

Стаць моднай —
Ох як рупіць!
Хутчэй купі,
Бо, як памрэш, —
Хто ж мне тады іх купіць?


Бабуля Наста,
Дзед Тарас
Маўчаць, нібы знямелі:
Што ёй сказаць на гэты раз? —
І клопат жа займелі!

...Шкада падчас бабуль, дзядоў.
Шкада, прызнаем шчыра.
А колькі модніцы гадоў?
Я адкажу:
Чатыры!



ЯШЧЭ РАЗ ПРА «МІНІ»...

Пра стыль,
Пра моду —
Зноў дэбаты.
Хоць быў, здаецца,
Поўны штыль.
Дзяўчо нацвельвае цыбата —
Вярнуўся зноўку
Міні-стыль.



Не дзіўна —
Раптам спатыкнуцца,
Забыць пра высевы марнчын:
З-пад «міні»
Сцёгны ўпарта мкнуцца
Бліжэй
Да позіркаў мужчын.

Не дзіўна —
Ўсцешыцца спадманам:
«Ах, як з душою саўладаць!..»
Не дзіўна —
Максі-донжуанам,
Не дзіўна —
Развядзёнам стаць!

Спаднічка
Ветразем напятым,
Здаецца,
Трэсне на клубах:
Дзяўчо пацвельвае цыбата,
Ды ўжо...
Табе не па зубах...

Тупоча,
Бы па даўняй таксе
Камусь
Надзеі раздае...
Спаднічка —
Міні,
Ногі —
Максі.
А розум?
Ён які ў яе?



ШТАНЫ

Сымон абноўку ў гэты раз
Прымерваў самавіта.
Да жонкі выйшаў на паказ:
— Зірні, ці ладны світэр?

Зірнула жонка — сінь вачэй
Гусцейшай стала раптам:
— Эх, падабраць штаны б яшчэ, —
Хадзіў бы франтам!

Цябе такім я нават сню.
Калі не засярдуеш,
Сяброў, сяброўак абзваню —
Па блату купім, чуеш?

— Нашто сябры, навошта блат? —
Сумеўся муж, зазначыў, —
Штаноў цяпер усюды шмат,
Сам знаю,
Сам іх бачыў.

А жонка ў злосці:
— Ты цяльпук!
Ты трошкі хоць шурупіш?
Без блату,
Без патрэбных рук
Ці ж добрае што купіш?..



І вось, займеўшы адрасок,
Каб не чакаць, адразу
Сымон, як хлопчык, упадскок
Пашыбаваў... на базу.


Знайшоў пратэктара свайго,
Дзесятку ў лапу кінуў.

А ён, бы дурня,
да т а г о
Паслаў, скрывіўшы міну.

— Адну хвілінку! —
т о й шапнуў,
Чырвонцы згробшы ўпраўна.
Штаны з аглядкай разгарнуў:
— Тавар люксовы, праўда?..

...Сымон абноўку ў гэты раз
Прымерваў чынна, строга.
Да жонкі выйшаў на паказ:
— Зірні, штаны нічога?

Скавала ўраз кабету млосць,
Нібы абдаў хто варам.
— Такія ў ЦУМе зараз ёсць,
Такіх паўсюль навалам!
Нашто, скажы, табе яны,
Ды за такія грошы?!
— Дзівачка, глянь, што за
штаны:
Я ж іх узяў ... па блату.



КУЛЬТУРНАЯ ПРАГРАМА

Знаёмыя, сустрэўшыся ў піўной,
Вядуць гаворку між сабой.



Адзін —
Вясёла-зухаваты.
Другі —
Маркотна-сумнаваты:
Над куфлем горбіцца, маўчыць —
Настрой ці ўдасца размачыць?


Затое першы...
Ён за трох
Мог словы сыпаць,
Як гарох:
— Нямала ўсё ж — два выхадных:
На стому забываеш!
Скажы, як ты праводзіш іх,
Як ты адпачываеш?
«Казлы» не мраяцца у сне?
Не дужа вабіць крама?
— Ды не: штовыхадны ў мяне —
Культурная праграма.

— Відаць, канцэртаў і кіно,
І лекцый не мінаеш?



— А як жа!
З імі даміно
Наўрад ці параўнаеш!
Субота прыйдзе, устаю —
Душа бы ў ладкі плешча:
Канцэрт я ў гэты дзень даю
У доме —
Жонцы, цешчы.

Нядзеля ж прыйдзе — ўлегцы я,
З нуды ледзь не скуголю:
Я слухаю іх лекцыю
Аб шкодзе алкаголю.




РОЗДУМ-ПЛАЧ

КАЛЯ... ДАЧ

Шнурую,
Шурую,
Чарую:
«Дзе дошкі, цэмент я знайду?..»
Шчырую,
Мудрую,
Мурую —
Як цэглу, чырвонцы кладу.

Калі буду мець я аддачу?
Ці блізка ўжо клопатаў дно?
Будуючы дачу,
Рашаю задачу, —
Адказу ж у ёй не відно.

Нашу прэйскурант, як задачнік,
Дзе ўмова — з цаною — адна...
Не дачнік-удачнік,
А школьнік-няўдачнік, —
Штодня на нагах адвідна.



Я нервы псую, лямантую —
Уелася дача ў нутро!
За час,
Што будую-бядую,
Мой шэф збудаваў бы метро.

Калегу свайму з будканторы
Адбіў бы званочак-паклон, —
І зрушылі б хорам,
І вырас бы хорам,
Напэўна, за некалькі дзён.

Дый гэта яго не турбуе,
Шаноўнага шэфа майго:
Ён «Волгай» на дачу
І з дачы шыбуе —
Казённая дача ў яго.

Ён часам жартуе, даводзіць:
«Мець дачу —
Не плён, а праклён...»
Ды чуткі ўжо ходзяць,
Што шэфа скароцяць, —
Хто выйграе ўсё ж:
Я ці ён?

НАШТО БАБЕ АГАРОД?

Нашто бабе агарод,
Калі баба стара...

З народнай песні

Нашто бабе агарод,
І свінчо таксама,
Калі бабе...
Трыццаць год
І пад бокам крама?


Нашто жыць у таўкатні,
Гэткім увіханні,
Калі бабе
Дзень пры дні
Смачна спіцца ўранні?

Нашто бабе ў хаце печ,
Граблі у аборы,
Калі баба наша — спец,
Робіць у канторы?

Нашто ёй, бы ў горле косць,
Куры, кураняты,
Калі ў бабы
Клопат ёсць —
«Жыгулі» ля хаты?

Нашто бабе мазалі? —
І без іх не прыкра,
Бо ад працы на зямлі
Бабачка адвыкла!


Ці то ўрод,
Ці то няўрод —
З мясам, з хлебам смачным
Корміць бабу агарод,
Ды не свой,
А — матчын.



МОЙ ГРЫША,


МОЙ ХАРОШАНЬКІ...

Мой Грыша, мой харошанькі,
Кашуля — у гарошынкі.
На ганачку пратупае —
Як пройдзе хто са ступаю.
Калі ж адчыніць дзверачкі —
Пападаюць талерачкі.
А ў хатачку праціснецца —
Ад жалю сэрца сціснецца.
А на тапчан заваліцца —
І сонейка схаваецца.
Калі ж засне —
Вартую сон,
Ён спіць, а я ўсё дзьмухаю:
Я адганяю мух,
Каб ён
Радзей хадзіў... пад мухаю.



АНТОНАЎКІ

Антон
Антонаўкі любіў,
Але —
Не садавінай:
Ён цісну́ў сок,
Віно рабіў,
Быў «спец» па справе
віннай.



Раз бутлю з дачы прыцягнуў,
Без груку, без гамонкі
Яе ў камору запіхнуў —
Далей ад вока жонкі.

Схаваў ён бутлю у куток:
«Няхай там дрожджы
бродзяць...»
Бо лішні градус,
Лішні клёк
Не мог пітву пашкодзіць.

Але не вытрымала шкло
Бунтоўнай сілы з часам

Віно пабегла, пацякло
На волю самапасам!

Ці ж гэта бачыць мог
Антон —
І бунт віна, і ўцёкі?
Яму салодкі сніўся сон —
Цадзілі хмель аблокі!

Ды неспадзеўна ранічкой
Сусед прыскочыў знізу.
Як выжал злы.
Перад сабой
Чамусь трымае місу.

Стаіць, сандалямі туп-топ,
Куснуць гатоў, здаецца.
— Ты ж мне...
Ты ж мне...
Ўчыніў патоп!
Што за брыдота льецца?..




3 Зак. 204

Яшчэ з дзвярэй,
Яшчэ здалёк
Убачыў ён:
З талеркі-люстра
На дол збягае ручаёк,
Нібы жывіца,
Густа.

А водар гэтакі цячэ,
Як з бутлі той вядзёрнай.
Сусед жа бліжай валачэ:
— На столь, на столь
Зірні яшчэ. —
Чаму ўся стала чорнай?..

Антон
Антонаўкі любіў —
І смак,
І сок выдатны!
З-за іх рамонт Антон рабіў
Суседу.
І — бясплатны!



ДЗЕД ПАПЛЫЎ ПА РЫБУ...

Дзед паплыў па рыбу —
Юшку сніў штоночы.
Свежай рыбкі
хіба
З вас ніхто не хоча?

Выбраў дзед затоку.
Як і сам,
глухую:
«Ой, не будзе толку,
Як не памазгую!
Ой, не будзе ўлову,
Як не пашчырую!
Юшкай адмысловай
Ці ж здзіўлю старую?..»

Нетаропка, дбала
З лодкі неўпрыкметку,
Як рыбак бывалы,
Дзед закінуў... сетку.




І злавіў ён рыбку —
Не ярша,
Не плотку:
З хвалі чуйнай, зыбкай
Не падняць
У лодку!

Дзед ужо не рады —
Не чакаў такога.
Бачыць —
З рыбнагляду
Мчыць-ляціць падмога!

Дзед зірнуў нявесела,
Сетку ўзяў —
Прыгнула:
На чатыры пенсіі
Рыбка пацягнула!





КУРОРТНЫЯ

ПЕРАЎТВАРЭННІ


На пляж і з пляжа —
Пад руку.
Ідуць, смяюцца звонка.
Кабеты шэпчуцца ў цяньку:
— Відаць, мужык і жонка.

Іх сапраўды не разлучыць:
Адзін з адным,
Як скуты.
Чаму ж, пад ручку ідучы,
Аглядваюцца ўсюды?

Які кадук грызе яго?
Што з ёй,
З яго каханай?
— Каб хоць знаёмага каго
Не стрэць неспадзявана!..

Іх дні, нібыта нацянькі
Праз пляж,
Праз бар ляцелі.
Хоць спёкай дыхалі дзянькі,
Пачуцці ж —
Халадзелі.

Калі ж мядзяным халадком
Забразгала заначка, —
Ён стаў ёй толькі...
землякам.
Яна ж яму —
Зямлячкай...




БЛІННЫ КАРОЛЬ

Я, браткі мае, жаніцца
і хацеў, і не хацеў.
Але ў цешчы прычасціцца
давялося неўспадзеў.

А яна бліноў на ранку
мне падсунула з гару.
Каля іх, каля мачанкі
ўпрэю, думаў я, згару!

Як жа мне было ўстрымацца,
не хадзіць на той парог?
Цешчы гэткай адцурацца
толькі, мусіць, дурань мог!

Свой цяпер я ў гэтай хаце —
парадніўся веснім днём.
Стаў я ў цешчы любым зяцем,
блінным стаў я каралём.



Малаком іх запіваю,
запіваю — напяваю:
— Ой, бліны, ой, дранікі,
дранікі-смятаннікі!

варта мне на іх налегчы —
не нагнуцца,
не пабегчы!

— Ой, мае грачанікі,
ой, бліны-мачаннікі:
схопіш нават на хаду —
цягне суткі на ваду!

— Ой, блінкі ды ячныя,
пульхныя, гарачыя:
як стажок з ахвоткі ўмелеш —
сам, як блін той, пакруглееш!

Не да жоначкі, браткі, мне,
з цешчай бачуся адно:
цэлы стог бліноў падкіне,
сяду — жонкі не відно!

І сказала жонка ўчора,
Ганя сціплая мая:
— На развод падам я скора,
выбірай: бліны ці я?


Падгарэлым, чую, пахне,
ды які мне выбраць ход:
ці застацца пры блінах мне,
ці згадзіцца на развод?

Ой, бліны,
блінкі,
бліночкі!

УСЁ ЯСНА...

З П. Глазавога


Невядомая хвароба
нейк прыстала да Лукі:
Паявіліся чамусьці
на лапатках бугаркі.
Да бальніцы мчыцца хворы.
Перад доктарам хутчэй
Скінуў похапкам сарочку
з разгарачаных плячэй.
Сеў. узрушана пытае,
хоць і быў негаваркі:
— Скуль, скажыце, узяліся
на лапатках бугаркі?
Глянуў доктар недаўменна —
што за дзіва-навіна?
— Вы п'яце?
— Не піў ніколі
ні гарэлкі,
ні віна.
— Часта курыце?
— Ніколі і не нюхаў цыгарэт.
— А з жанкамі як?
— Ну што вы?
Ненавіджу ўсіх кабет!
— Ясна ўсё, — прамовіў доктар. —
Лекі рады не дадуць:
Гэта ў вас, нібы ў анёла,
мусіць, крылы ўжо растуць.



САКРЭТ

Ігар Янавіч Жулега
На нарадзе гарадской
Неяк сябру і калегу
Свой паведаў неспакой:
— На мяне радзей ківалі б,
Я трывогу б не трубіў:
Грызуны апанавалі —
Марна ўсё,
Што ні рабіў.

— Што скажу я, што параю?
Не сядзі, а ў трэст схадзі,
Джаз-аркестр для рэстарана
Выбі ў трэсце, завядзі.
Гэты сродачак —
Рулады —
Трэсту, праўда, у наклад:



Музыканты ж на акладах.
Што ні зух,
То ўсё — аклад.

Але ж граюць як належыць, —
За квартал чуваць іх гром.
Як ударацъ,
Як урэжуць, —
Столь і сцены хадуном!
Вось пабачыш — хутка досыць
След прастыне ад гайні:
Грызуны не пераносяць
Шумнай музыкі
Ані!

— Дзякуй, дружа, за параду, —
Аж расцвіў Жулега ўраз. —
Я іх выжыву са склада!
Як і ты, займею джаз!..

...Быў я ў гэтым рэстаране,
Быў я разу аднаго.
Бачыў джаз, яго старанне,
Слухаў музыку яго.


Джаз грымеў —
Аж лёскат слаўся,
Біў у вушы зноў і зноў:
Ці для нас ён так стараўся,
Ці выкурваў грызуноў?



КРЫЎДА СТАРОГА ПЕГАСА

Пырнічак скубу на ўзмежку рэдкі.
Што такое стала з літбратамі? —
Ледзь не ўсе паэты і паэткі
Скакункоў жалезных забрыталі.

Засталося толькі з іх дзівіцца,
Засталося толькі ўслед жагнацца:
За такой стрыгункай-жыгуліцай
Як ні жылься,
Мне, відаць, не ўгнацца!



Так ірвуць —
Ажно трашчаць пастронкі!
Ездакі ж усе —
Ліхога класа...
Як суддзя той,
Назіраю гонкі —
Ад варот СП і да Парнаса.

Хто каго
Да ўзбочыны адцісне?
Хто каго,
Як навічка, абставіць?
Можа, час настаў,
Зусім не лішне
Ля Парнаса
Пост ДАІ паставіць?..

Пырнічак скубу на ўзмежку рэдкі.
А было ж, было ж на добрым часе:
Ледзь не ўсе паэты і паэткі
Ласкай бралі: «Памажы, Пегасе...»

А цяпер, глынуўшы горкай крыўды,
Ля Парнаса ўлегцы галасую,
Быццам стаў нямоглы і бяскрылы —
На Парнас імкліва
Не ўзнясу іх?!

На Парнасе жвіру, цэглы груды —
Скуль крынічка творчасці ўзялася?
На Парнасе ўздым,
Размах паўсюды —
Гаражы будуюць на Парнасе!



ГАВАРЫЦЕ, ЛЮДЗІ...

Гаварыце, людзі, і адкрыта —
Пра вайну,
Пра мір,
Пра хлеб,
Пра квас,
І пра тых,
Хто ля свайго карыта,
Атлусцеўшы, неўпрыкмет загразь.

Вы ж былі не ўгоднікі-маўчальнікі,
Вы ж не раз крычалі,
                    ды не ўслых.
Гаварылі ж найчасцей начальнікі,
Знізу і да верху,
І — за ўсіх!

Гаварыце, людзі, гаварыце
Пра пустыні ў душах, скразнякі,
Пра сумленне, што у дэфіцыце, —
З дабрабытам зблыталі дзялкі.

І чаму дзіравай стала памяць —
Пагубляла рэкі і лясы?
Як маглі азёры ўсе запляміць —
Адабраць чароўнасць
Іх красы?

І чаму, як год — дык меней дзетак?
І чаму, як той палын-трава,
Развялося мноства прайдзісветаў:
На нашчадка кожнага —
Па два?

Як праз шкло ружовых акуляраў
Не хацелі заўважаць падман,
А хадзілі з п'яніцам у пары
Прастытутка, школьнік-наркаман?!

Гаварыце, людзі, гаварыце
Пра жыццё, якім павінна быць.
Толькі горла дужа не дзярыце —
Можна голас і давер згубіць.

Гаварыце, людзі, гаварыце,
Ды язык, вы знайце,
не трапло,
Ды, як плугам тым,
глыбей бярыце, —
Можа б, меней пырніку ўзышло!

Не маўчыце, людзі, гаварыце,
Каб да нетраў сутнасці дайсці,
І хлусні скляпенні разбярыце
На падмуркі Праўдзе:
Ёй — расці!



ЗМЕСТ

Што са мной? 5
Даўгі 6
Сенькава шапка 8
Шпунт 10
Крывая... матэматыка 12
Нукайла 13
Прылаўкі... са шкла 15
Непрацоўныя даходы 16
Пестуны 17
Модніца 20
Яшчэ раз пра «міні»... 22
Штаны 24
Культурная праграма 26
Роздум-плач каля... дач 28
Нашто бабе агарод? 30
Мой Грыша, мой харошанькі... 31
Антонаўкі 32
Дзед паплыў па рыбу... 35
Курортныя пераўтварэнні 37
Блінны кароль 38
Усё ясна... 40
Сакрэт 41
Крыўда старога Пегаса 43
Гаварыце, людзі... 45

Николай Николаевич ЧЕРНЯВСКИЙ

ЗАЧЕМ БАБЕ ОГОРОД!

Рэдактар І. К. СТАДОЛЬНІК

Тэхрэдактар Г. В. АФАНАСЬЕВА. Карэктар В. М. ШУСТ.

Здадзена ў вытворчасць 08.05.89. Падпісана да друку 06.06.89.
Фармат 70×108 1/32. Папера друкарская № 2.
Новагазетная гарнітура. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,0. Ум. фарб.-адбіткаў 2,6. Ул.-выд. арк. 1,5.
Тыраж 30057 экз. Заказ 204. Цана 10 кап.

Адрас рэдакцыі:
220041, Мінск, Ленінскі праспект, 77.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга
друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.